ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
21.09.2023 № 45

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2023 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

1. Дадзеная Інструкцыя распрацавана ў адпаведнасці з артыкуламі 17 і 209 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры, пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 2 красавіка 2015 г. № 263 «О проведении на территории Республики Беларусь отдельных централизованных культурных мероприятий» і ўстанаўлівае агульны парадак арганізацыі, падрыхтоўкі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2023 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры (далей – конкурс).

2. Конкурс праводзіцца ў мэтах:

адраджэння, развіцця, папулярызацыі лепшых традыцый і дасягненняў нацыянальнага выяўленчага мастацтва;

аздаблення творамі выяўленчага мастацтва інтэр'ераў грамадскіх будынкаў.

3. Арганізатарамі конкурсу з'яўляюцца Міністэрства культуры, аблвыканкамы, Мінскі гарвыканкам, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў Рэспублікі Беларусь» (далей – НЦСМ).

Канкрэтныя тэрміны правядзення конкурсу вызначаюцца Міністэрствам культуры.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт на афіцыйным сайце Міністэрства культуры і павінна змяшчаць звесткі аб месцы і тэрмінах правядзення конкурсу, умовах, парадку і тэрмінах аб'яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. У конкурсе могуць прымаць удзел прафесійныя мастакі, іншыя творчыя работнікі ў галіне выяўленчага мастацтва, якія маюць прафесійны сертыфікат творчага работніка, а таксама студэнты ўстаноў вышэйшай адукацыі ў галіне выяўленчага мастацтва – грамадзяне Рэспублікі

Беларусь, а таксама замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, маюць (або атрымліваюць) прафесійную адукацыю ў галінах выяўленчага мастацтва, дызайну, мастацтвазнаўства або не маюць прафесійнай адукацыі ў галінах выяўленчага мастацтва, дызайну, мастацтвазнаўства, але з'яўляюцца членамі творчых саюзаў (далей – удзельнікі конкурсу).

6. Конкурс праводзіцца ў мэтах стварэння 21 жывапіснай работы для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў установаў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры ў абласцях і г. Мінску (па тры ўстановы ў кожнай вобласці і г. Мінску) у два этапы. Пералік установаў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прыкладнай тэматыкі і памераў ствараемых работ дадаецца (дадатак 1).

7. Конкурс праводзіцца ў два этапы:

першы этап з'яўляецца адборачным;

на другім этапе падводзяцца вынікі конкурсу.

8. На першым этапе ў перыяд з 1 сакавіка па 1 мая 2023 г. удзельнікі конкурсу накіроўваюць у НЦСМ (г. Мінск, вул. Някрасава, 3, тэл. , +375 17 235 03 31, +375 17 399 09 78):

заяўку на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам 2 да дадзенай Інструкцыі;

эскіз жывапіснага твора (у матэрыяльным або раздрукаваным выглядзе);

копіі старонак 31 і 33 пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь (пры яго наяўнасці) або, пры яго адсутнасці, старонак пашпарта грамадзяніна замежнай дзяржавы, дзе ўказаны звесткі аб прозвішчы, імя, імя па бацьку ўдзельніка конкурсу, дата і месца яго нараджэння, звесткі аб пашпарце і яго выдачы, пасведчання аб нараджэнні, права на жыхарства.

Усе матэрыялы да ўдзелу ў конкурсе афармляюцца ў асобны канверт (папку).

Своечасова пададзенымі будуць лічыцца заяўкі, якія былі дастаўлены і зарэгістраваны ў дырэкцыі не пазней за 17.00 1 мая 2023 г. або адпраўлены па пошце не пазней 1 мая 2023 г. (па даце на паштовым адпраўленні).

9. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, устаноўленых пунктам 8 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

10. Выдаткі па стварэнні эскізаў аплачваюць удзельнікі конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам конкурсу ў азнаямленні

з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння эскіза твора выяўленчага мастацтва.

11. Адбор эскізаў для далейшага стварэння твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу ў перыяд з 2 па 20 мая 2023 г. ажыццяўляе Рэспубліканская экспертная камісія па творах выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (далей – камісія). На пасяджэнне камісіі могуць запрашацца прадстаўнікі аблвыканкамаў, Мінскага гарвыканкама, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры.

Крытэрыямі адбору з'яўляюцца:

адпаведнасць прапанаванай тэматыцы, жанру, памерам твора выяўленчага мастацтва;

высокі мастацкі ўзровень выканання.

12. Рашэнне аб адборы эскізаў прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

13. Спіс эскізаў, адабраных для стварэння твораў выяўленчага мастацтва, публікуецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры не пазней пяці дзён пасля афармлення пратакола пасяджэння камісіі.

14. У перыяд з 20 мая па 1 лістапада 2023 г. аўтары-пераможцы першага этапу конкурсу, ствараюць творы выяўленчага мастацтва ў адпаведнасці з эскізамі.

Выдаткі па стварэнні твораў выяўленчага мастацтва аплачваюць удзельнікі конкурсу.

Структурныя падраздзяленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, якія ажыццяўляюць дзяржаўна-ўладныя паўнамоцтвы ў сферы культуры, аказваюць садзейнічанне ўдзельнікам конкурсу ў азнаямленні з краявідамі, будынкамі, дакументамі па гісторыі рэгіёна, неабходнымі для стварэння твора выяўленчага мастацтва.

15. У перыяд з 1 па 15 лістапада 2023 г. удзельнікі другога этапу конкурсу прадстаўляюць свае працы ў НЦСМ (г. Мінск, вул. Някрасава, 3, тэл. +375 17 235 03 31, +375 17 399 09 78).

16. У перыяд з 15 лістапада па 1 снежня 2023 г. камісія разглядае творы выяўленчага мастацтва і прымае рашэнне аб рэкамендацыі іх да набыцця Міністэрствам культуры за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Рашэнне аб рэкамендацыі да набыцця твораў выяўленчага мастацтва

прымаецца шляхам адкрытага галасавання простай большасцю галасоў членаў камісіі. Рашэнне лічыцца правамоцным, калі на пасяджэнні прысутнічала не менш за дзве трэці іх агульнага складу камісіі. Пры роўнасці галасоў прымаецца рашэнне, за якое прагаласаваў старшыня.

Рашэнне камісіі афармляецца пратаколам, які падпісвае старшыня і сакратар на працягу пяці дзён пасля дня правядзення пасяджэння.

17. Творы выяўленчага мастацтва набываюцца Міністэрствам культуры за кошт сродкаў, прадугледжаных у рэспубліканскім бюджэце Міністэрству культуры на правядзенне цэнтралізаваных культурных мерапрыемстваў, і перадаюцца ўстановам дадатковай адукацыі ў сферы культуры дзяцей і моладзі для аздаблення інтэр'ераў памяшканняў.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2023 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

ПЕРАЛІК
устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, прыкладнай тэматыкі і памераў ствараемых работ

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора мастацтва | Тэматыка твора мастацтва |
|---|---|---|---|
| **Брэсцкая вобласць** | | | |
| Брэсцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Знаменская дзіцячая школа мастацтваў» | 42 х 59,4 см | Злучэнне відаў мастацтва: музыка і жывапіс |
| Маларыцкі раён | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі «Маларыцкая дзяржаўная дзіцячая школа мастацтваў» | 59,4 х 84 см | Адзінства мастацтваў (аб'яднанне ў творы жывапісу відаў мастацтва: музычнага, выяўленчага, тэатральнага і харэаграфічнага) |
| Івацэвіцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г.п. Целяханы» | 50 х 70 см або 60 х 80 см | Сінтэз мастацтваў у кантэксце выяўленчага мастацтва і музыкі |
| **Віцебская вобласць** | | | |
| Глыбоцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Глыбоцкая дзіцячая мастацкая школа імя Язэпа Драздовіча» | 50 х 70 см | Пейзаж або нацюрморт на вольную тэматыку |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора мастацтва | Тэматыка твора мастацтва |
|---|---|---|---|
| г. Наваполацк | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая мастацкая школа імя І.Ф.Хруцкага г. Наваполацка» | 60 x 80 см | Пейзаж ракі Заходняя Дзвіна на фоне Сафійскага сабора |
| Шаркаўшчынскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Шаркаўшчынская дзіцячая школа мастацтваў» | 1 x 1,6 м | Летні пейзаж |
| **Гомельская вобласць** | | | |
| Рэчыцкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Рэчыцкая дзіцячая школа мастацтваў Гомельскай вобласці» | 105 x 100 см | Знакамітыя ўраджэнцы Рэчыцкага раёна (увасабленне ў адной мастацкай канцэпцыі трох выдатных асоб: кампазітара Генадзя Ермачэнкава, мастака Леаніда Абрамовіча і акцёра Яўхіма Копеляна) або пейзаж з краявідамі г. Рэчыцы |
| Ельскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Ельска» | 1,5 x 1 м | Твор жывапісу для інтэр'ера канцэртнай залы школы: музычныя інструменты, на якіх іграюць дзеці |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора мастацтва | Тэматыка твора мастацтва |
|---|---|---|---|
| Рагачоўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Рагачова імя Анатоля Каплана» | 60 х 90 см | Пейзаж з архітэктурай: «Новы праваслаўны храм Святога Аляксандра Неўскага» ў г. Рагачове |
| **Гродзенская вобласць** | | | |
| Лідскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Лідская дзіцячая школа мастацтваў» | 60 х 50 см<br>80 х 60 см | Малая радзіма ў Год міру і стварэння |
| Навагрудскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навагрудская дзіцячая школа мастацтваў» | » | » |
| Астравецкі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Астравецкая дзіцячая школа мастацтваў» | » | » |
| **Магілёўская вобласць** | | | |
| Мсціслаўскі раён | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Мсціслаўская дзіцячая школа мастацтваў імя М.М.Чуркіна» | 1,2 х 1,5 м | Партрэт М.М.Чуркіна на фоне г. Мсціслава (М.М.Чуркін – савецкі кампазітар і фалькларыст, адзін з заснавальнікаў беларускай прафесійнай музыкі, народны артыст БССР) |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора мастацтва | Тэматыка твора мастацтва |
|---|---|---|---|
| г. Бабруйск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў № 1 імя Я.К.Цікоцкага» | 2 х 3 м або дыпціх ці трыпціх | Твор мастацтва можа быць выкананы алеем у сучасным стылі і адлюстроўваць напрамкі дзейнасці школы мастацтваў. Музычныя вобразы могуць быць умоўныя, у якасці фона магчыма выява гістарычнага Бабруйска, дапускаецца выкарыстанне дэкаратыўных элементаў |
| г. Магілёў | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Магілёўская дзіцячая школа мастацтваў № 3 імя М.М.Салдатава» | Трыпціх 1,5 х 1,5 м 2 х 1,5 м 1,5 х 1,5 м | Адлюстраванне ў творы жанраў музыкі (вакальная, харавая, інструментальная) або выява вядомых сусветных дзеячаў музычнага мастацтва, якія праславілі дадзеныя жанры |
| **Мінская вобласць** | | | |
| г. Барысаў | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая мастацкая школа імя А.А.Анікейчыка г. Барысава» | 1,3 х 1,5 м | Кампазіцыйны партрэт А.А.Анікейчыка ў майстэрні |
| г. Маладзечна | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая мастацкая школа мастацтваў г. Маладзечна» | 1 х 0,8 м або 1 х 1 м | Краявіды горада Маладзечна з архітэктурнымі помнікамі ў спалучэнні з пейзажам у яркі сонечны дзень |

| Раён (горад) | Установа дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі ў сферы культуры | Памер твора мастацтва | Тэматыка твора мастацтва |
|---|---|---|---|
| г. Жодзіна | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая мастацкая школа мастацтваў г. Жодзіна» | 1,5 х 1 м | Пейзаж: рака Бярэзіна, стромкія берагі, хвоі, асветленыя сонцам, залатая восень (не позняя), бярозы |
| **г. Мінск** | | | |
| г. Мінск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 1 імя Л.П.Александроўскай г. Мінска» | 90 х 120 см | Партрэт Л.П.Александроўскай |
| г. Мінск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 9 г. Мінска» | 100 х 200 см | Сімбіёз відаў мастацтва |
| г. Мінск | Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 11 імя У.У.Алоўнікава г. Мінска» | 160 х 140 см | Дзіцячы хор (для размяшчэння ў харавым класе) |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2023 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры

Форма

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

______________________________

______________________________
Прозвішча, уласнае імя, імя па бацьку (калі такое маецца) аўтара

______________________________
Кантактныя тэлефоны

## ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў Рэспубліканскага конкурсу на стварэнне ў 2023 годзе твораў выяўленчага мастацтва па дзяржаўнаму сацыяльна-творчаму заказу Міністэрства культуры.

Паведамляю, што з'яўляюся аўтарам эскіза, які прадстаўлены мной для разгляду на конкурсе.

Абавязуюся прадставіць матэрыялы конкурсу (эскіз) да 1 мая 2023 г. не пазней за 17.00 па адрасе: 220040, г. Мінск, вул. Някрасава, 3, дзяржаўная ўстанова культуры змешанага тыпу «Нацыянальны цэнтр сучасных мастацтваў».

З умовамі конкурсу азнаёмлены і згодны.

| | | |
|---|---|---|
| ______________ | ______________ | ______________ |
| ініцыялы, прозвішча аўтара | подпіс | дата |